УДК 1(091):378.147БДУКМ

***В. М. Белакурскі,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў»*

# ПРАБЛЕМА ВЫКЛАДАННЯ ФІЛАСОФІІ СТУДЭНТАМ ТВОРЧЫХ ФАКУЛЬТЭТАЎ

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны праблеме выкладання вучэбнай дысцыпліны «Філасофія» на творчых факультэтах Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Аўтар разглядае шэраг актуальных метадычных пытанняў. Яны звязаны з тымі складанасцямі, якія паўстаюць перад выкладчыкам у працэсе чытання лекцый і правядзення семінарскіх заняткаў. Увага акцэнтуецца на спосабах данясення да свядомасці студэнтаў праксеалагічнага характару філасофскіх ведаў, творчых інтэнцый філасофіі, узаемасувязі філасофіі і мастацтва. Абгрунтоўваецца каштоўнасць гісторыка-філасофскага матэрыялу для метадалагічнага і метадычнага вырашэння задач навучальнага працэсу.

**Ключавыя словы:** глабалізацыя, культура, культурная прастора, культура постмадэрну, мастацтва, існасць, філасофія, методыка, навучальны працэс, творчасць, музычная творчасць, творчы працэс, творчыя факультэты.

***V. Belakurski,***
*PhD in Philosophy, Associate Professor, Associate Professor of the*
*Department of Social Disciplines of the Educational Institution*
*"The Belarusian State University of Culture and Arts"*

# THE PROBLEM OF TEACHING PHILOSOPHY TO STUDENTS OF CREATIVE FACULTIES

**Abstract.** The article is devoted to the problem of teaching the discipline «Philosophy» at the creative faculties of the Belarusian State University of Culture and Art. The autor considers a number of topical methodological issues. They are associated with the difficulties that the teacher faces in the process of lecturing and conducting seminars. Attention is focused on ways to convey to the consciousness of students the proxeological nature of philosophical knowledge, creative intentions of philosophy, the relationship of philosophy and art. The article substantiates the value of the historical and philosophical material for the methodological and methodical solution of the problems of the educational process.

**Keywords:** globalization, culture, cultural space, postmodern culture, art, genesis, philosophy, methodology, educational process, creativity, musical creativity, the creative process, creative faculties.

Філасофія эпохі постмадэрну дэманструе рэзкі адыход ад традыцыйных філасафем, яна ўсё больш раствараецца ва ўніверсаліях культуры і ў значнай ступені – ва ўніверсаліях мастацтва. Пошукі новых форм адносін суб'екта з навакольным светам, новае бачанне апошняга нарадзілі таксама новыя формы мастацкай дзейнасці. Адбыліся істотныя змены ў адносінах мастацтва да рэчаіснасці. Калі класічнае мастацтва адлюстроўвала рэальнасць, мадэрнісцкае імкнулася да яе пераўтварэння, то постмадэрнісцкае стварае рэальнасць, якая жыве ў свеце кіберпрасторы і сімулякраў (гіперрэальнасці). Новыя формы мастацтва падзяляюць людзей на тых, хто разумее, і тых, хто не разумее (Х. Артэга-і-Гасэт [2]). Такім чынам, сучасная мастацкая творчасць закладвае для гледача прынцыпова новыя асновы ўспрымання навакольнага свету, рэпрэзентуючы іх з дапамогай новых медыятэхнік. Пабудаваныя сучаснымі творцамі вобразы і сцэнарыі ў планетарным маштабе фарміруюць не толькі новыя кагнітыўныя карціны свету, але і прынцыпова новую філасофію мастацтва, якое рэтранслюецца як сеткай Інтэрнэт, так і з дапамогай культурнай прасторы іншых глабальных артпляцовак. Масавасць, усебаковасць і планетарнасць інфармацыйнага абмену зрабілі ўвесь свет «глабальным тэатрам» (М. Маклюэн). Усё гэта больш настойліва патрабуе сёння ад прафесарска-выкладчыцкага складу не толькі сучаснага асэнсавання тых змен, што заявілі аб сабе ў культуры, але і пошуку повых падыходаў да працэсу выкладання філасофскіх дысцыплін на творчых факультэтах устаноў вышэйшай адукацыі, у тым ліку з музычнай спецыфікай.

Безумоўна, філасофія працягвае заставацца самапазнаннем чалавецтва, рэфлексіяй над узаемадзеяннем нашага мыслення з нашым існаваннем. Яна заснавана на свабодзе думкі, сумненнях, пошуках, доказах і абвяржэннях. Разам з тым для непадрыхтаванага маладога чалавека яе катэгорыі пераважна выглядаюць незразумелымі абстракцыямі, а сістэмныя пабудовы нават знакамітых мысляроў – сінкрэтычнай блытанінай, далё-

кай ад рэчаіснасці. Таму для нас па-ранейшаму актуальным застаецца пытанне: як выкладаць прадмет.

Добра вядома, што студэнцкая аўдыторыя творчых факультэтаў даволі своеасаблівая. Пераважная большасць моладзі ахоплена зразумелым жаданнем атрымаць менавіта тыя веды, што звязаны з будучай прафесіяй і выканаўчым майстэрствам, не трацячы марна свайго часу на набыццё, як яны лічаць, «другасных» ведаў, тых, што не маюць прамога дачынення да прафесійнай дзейнасці. Але заўсёды знаходзяцца студэнты, якія выказваюць пазнавальны інтарэс да ўсіх прадметаў, у тым ліку і да філасофіі. Яны даверліва імкнуцца пачуць ад выкладчыка кароткія, зразумелыя і вычарпальныя адказы на тыя гамлетаўскія сэнсажыццёвыя пытанні, якія пачынаюць іх займаць усё больш і больш. Некаторыя з іх выказваюць жаданне атрымаць веды аб канкрэтных філасофскіх напрамках і праблемах. Бачанне гэтага патрабуе ад выкладчыка ўжо на першых лекцыйных і семінарскіх занятках уносіць істотныя карэктывы. З аднаго боку, ён павінен пакласці ў аснову патрабаванне навучыць студэнтаў самастойнаму мысленню, з іншага – накіраваць увагу слухачоў на праксеалагічны характар філасофскіх ведаў, знаходзячы адпаведныя і пераканаўчыя прыклады ў гісторыі мастацтва, жыцці кампазітараў, мастакоў, паэтаў, сучасных выканаўцаў і інш. Акрамя таго, выкладчыку неабходна выразна давесці да студэнтаў карціну суадносін філасофіі і мастацтва, а таксама, наколькі гэта магчыма, філасофскае разуменне творчага працэсу. Апошняе, у сваю чаргу, выклікае неабходнасць азнаямлення студэнтаў з духоўна-экзістэнцыяльнымі момантамі дзейнасці той ці іншай творчай асобы (напрыклад, Ф. Шапэна, Э. Верхарна, С. Далі і інш.), якія яна напружана перажывала падчас свайго творчага пошуку. На жаль, сёння пакуль недастаткова сур'ёзных сістэмных прац, у якіх аналізуецца філасофскі светапогляд выдатных кампазітараў, паэтаў і мастакоў. Гэта давала б студэнцкай моладзі творчых факультэтаў рэальную магчымасць больш глыбока зразумець, якім чынам тыя ці іншыя філасофскія ідэі набывалі сваё ўвасабленне ў геніяльных музычных, паэтычных, жывапісных творах аўтараў. Сёння выкладчык вымушаны «дыялектычна сумяшчаць» сваё асабістае бачанне таго неабходнага матэрыялу, які ён прапануе студэнтам, з метадычнымі патра-

баваннямі выкладання дысцыпліны, адукацыйных стандартаў і спадзяваннямі слухачоў.

Відавочна, што выкладаць філасофію, асабліва на творчых факультэтах, немагчыма без звароту да гісторыка-філасофскага кантэксту. Усім знаёмы словы класіка, які ў свой час заўважыў, што «гісторыя філасофіі і ёсць філасофія». Для таго, каб студэнт змог глыбей зразумець, як развіваецца любая культурная традыцыя, у тым ліку і філасофская, ён павінен вылучыць і супаставіць у гэтым працэсе адпаведныя гістарычныя адрэзкі часу. У выніку такой інтэлектуальнай рэдукцыі ў свядомасці маладога суб'екта пазнання, як нам падаецца, можа ўзнікнуць тая духоўная прастора, дзе ён раптам аказваецца быццам бы філасофскім саўдзельнікам і суразмоўцам Канфуцыя, Платона, Дэкарта, Канта і іншых мысляроў. Гэты пазнавальны фенамен «сустрэчы з вялікімі» ў нашым выпадку будзе надзвычай характэрным увасабленнем таго, што ўяўляе сабой у культуры эўрыстычны дыялог паміж мінулым і будучым, замкнёны сёння на асобе студэнта. Менавіта ў такім творчым пошуку маладой пазнавальнай асобы, як мы спадзяёмся, павінна абудзіцца і знайсці сучаснае прымяненне маеўтыка Сакрата. Філасофскае спасціжэнне зменлівай рэчаіснасці становіцца магчымым толькі ў форме творчага пошуку, падчас якога атрыманыя вынікі паўстаюць перад студэнтам не канчатковымі і завершанымі, а адкрытымі для далейшага ўдакладнення і паглыблення.

На наш погляд, мэтазгодна з першых заняткаў накіроўваць творчую студэнцкую аудыторыю на разуменне таго, што нават у часы Старажытнай Грэцыі філосафы і паэты пастаянна спаборнічалі паміж сабой як носьбіты мудрасці. Платон, каб вырашыць пытанне, «ці з'яўляецца паэзія сапраўдным мастацтвам», аналізаваў існуючы ў той час погляд на функцыі паэтатворцы, які павінен быць «бацькам мудрасці». Антычны мысляр таксама патрабаваў ад чалавека «практыкаваць душу», займаючыся музыкай і ўсім тым, што адносіцца да філасофіі. Важна давесці да ведама студэнтаў, што музыка, на якой акцэнтаваў увагу Платон, – «мусічная», філасофская, гэта значыць, натхнёная богам, якая не толькі выражае, але і прадстаўляе асновы светапабудовы. Паводле Платона, яна раскрывае як адзінства існасці, так і шляхі яе філасофскага

спасціжэння. Багацце філасофска-метафізічнага ў музыцы аўтар спрабуе давесці да выканаўцаў, сярод якіх толькі некаторыя, на яго погляд, здольны ўзняцца да сапраўдных філасофскіх вышынь. У дыялогу «Тымей» Платон асобна падкрэслівае: «Музы дараваны "…кожнаму свайму разважліваму прыхільніку не дзеля бессэнсоўнага задавальнення …, але як сродак супраць разладу ў кругавярчэнні душы, які павінен яе прывесці да ладу і ўзгодненасці з самой сабою"» [4, с. 450]. Трэба асобна засяродзіць увагу студэнтаў на тым, чаму парада філосафа асабліва сёння дэманструе сваю актуальнасць.

У навуцы даволі трывала ўсталявалася спалучэнне такіх двух паняццяў, як мысленне і творчасць, што сведчыць аб іх дыялектычным адзінстве. Платон у дыялогу «Пір» сцвярджаў, усё тое, што выклікае пераход ад небыцця да існага, – творчасць. «Насамрэч, усялякі пераход аднаго прадмета з небыцця ў быццё заснаваны на вядомай творчасці, так што дзейнасць у галіне ўсіх мастацтваў ёсць свайго роду паэзія, а ўсе майстры ў іх – паэты» [3, с. 115]. Важна накіраваць роздум студэнцкай моладзі на тое, што розніца паміж творчым працэсам у мастацтве і філасофіі ў значнай ступені залежыць ад дамінавання ў светапоглядзе пазнавальнага суб'екта менавіта ўзроўню светаадчування, а не светаразумення. Разам з тым мастацкая карціна свету творцы не перашкаджае апошняму ўспрымаць універсум у яго цэласнасці, пранікаючы ў сэнс адзінства існасці шляхам стварэння пачуццёвых вобразаў, адкрыцця сувязі паміж імі. Такім чынам, мастацкая творчасць суб'екта таксама садзейнічае спасціжэнню аб'екта, абыходзячы дыскурсіўна-лагічны спосаб мыслення. Тым не менш усё гэта пашырае і ўзбагачае духоўную прастору культуры. Мабыць, таму вядомы прадстаўнік постмадэрнізму Ж. Дэлёз прызнае: «Вялікія мастакі – гэта таксама і вялікія мысляры, але ўсе яны мысляць катэгорыямі ўспрымання і афектаў, а не паняццямі: мастакі думаюць у формах ліній і колераў, таксама, як музыканты думаюць гукамі, рэжысёры мысляць вобразамі, пісьменнікі думаюць словамі і г. д.» [1, с. 53].

Адметна і тое, што ў нашы дні мастацтва ўсё больш прымярае на сябе новую ролю, спрабуючы абвергнуць традыцыйны падзел на аб'ектыўныя навукі і суб'ектыўнае бачанне творцы. Творчы суб'ект усё больш настойліва прэтэндуе на месца

даследчыка ў сваёй спецыфічнай сферы. У наш час гэта абумоўлена з’яўленнем новых тэхналогій, якія ў значнай ступені спрыяюць сучаснаму мастацтву рэалізоўваць гнасеалагічныя тэндэнцыі ў розных варыятыўных мастацкіх формах, пашыраючы тым самым прастору творчай фантазіі суб’екта. Тэхналогіі робяць мову мастацкага твора шматмернай, прапануючы адпаведныя інструменты для эксперыменту творцы. У выніку новыя формы мастацтва, як і традыцыйныя, выступаюць унікальным спосабам рэфлексіі над навакольным светам. Разам з тым важна настойліва нагадваць студэнтам, што неабмежаванае пашырэнне магчымасці сучасных тэхнічных сродкаў, у прыватнасці электронных музычных інструментаў, прывяло да нараджэння бязмежнага мноства гукаў рознага тэмбру, у тым ліку не існуючых у прыродзе. З гэтай нагоды даволі вядомыя майстры сучаснага музычнага мастацтва, такія, напрыклад, як Джуліан Ленан, выказваюць сваю занепакоенасць і трывогу адносна таго, што электронная і прынамсі камп’ютарная тэхніка становіцца сёння не толькі «забойцам» чалавека-кампазітара і выканаўцы, але і слухача. Дадзенае пытанне, на наш погляд, заслугоўвае больш падрабязнага абмеркавання са студэнтамі на адпаведных семінарскіх занятках па філасофіі ў кантэксце абмеркавання праблемы «чалавек – тэхніка».

Згодна нашаму меркаванню, лекцыя ў творчай аудыторыі не можа быць кожны раз пабудавана на аснове адной і той жа метадычнай схемы. Лектару неабходна імкнуцца падаць пэўны эксклюзіўны матэрыял як па змесце, так і па форме. Адзначым, што большасць тэм курса даюць выкладчыку ў поўнай меры рэалізаваць гэту магчымасць. Напрыклад, пры крытычным падыходзе да псіхааналітычнай канцэпцыі З. Фрэйда, у якой творца (кампазітар, паэт, мастак і інш.) звычайна паўстае перад псіхааналітыкам як хворая асоба, а яго свядомасць – змесцішча ўсіх заган і распусты.

На семінарскіх занятках, на нашу думку, трэба ў першую чаргу наблізіць студэнта не толькі да вывучэння, але і да разумення арыгінальных філасофскіх тэкстаў, якія маюць прамое дачыненне да мастацтва, напрыклад: «Пір» Платона, «Нараджэнне трагедыі з духу музыкі» Ф. Ніцшэ і г. д. Разам з тым важна паказаць студэнцкай моладзі, што філасофскія тэксты прынцыпова нельга чытаць так, як звычайна чытаецца

тэкст мастацкай літаратуры. Першы «таемна» ўтрымлівае «непразрыстыя», нябачныя «непадрыхтаванаму воку» слаі. Іх паслядоўнае і больш глыбокае адкрыццё залежыць менавіта ад паступовага развіцця і мацавання індывідуальнай філасофскай культуры тым ці іншым студэнтам. Акрамя гэтага, на семінарскіх занятках трэба заўсёды знаходзіць належнае месца для аналізу канкрэтных праблем, а таксама сітуацый у сферы мастацтва, якія патрабуюць філасофскага асэнсавання.

У заключэнне адзначым, што наш погляд на пэўныя цяжкасці і праблемы ў выкладанні курса філасофіі, спосабы іх пераадольвання фарміраваўся на аснове вопыту, звязанага з працай на творчых факультэтах БДУКМ.


1. *Делёз, Ж.* Фрэнсис Бэкон: Логика ощущения / Ж. Делёз. – СПб. : Machina, 2011. – 176 с.

2. *Ортега-и-Гассет, Х.* Дегуманизация искусства и другие работы. Эссе о литературе и искусстве / Х. Ортега-и-Гассет ; пер. с исп. С. Васильевой [и др.]. – М. : Радуга, 1991. – 639 с.

3. *Платон.* Пир / Платон ; пер. с греч. С. К. Алта // Собр. соч. : в 4 т. – М., 1990–1994. – Т. 2 / общ. ред. А. Ф. Лосева, В. Ф. Асмуса, А. А. Тахо-Годи. – 1993. – С. 81–134.

4. *Платон.* Тимей / Платон ; пер. с греч. С. К. Алта // Собр. соч. : в 4 т. – М., 1990–1994. – Т. 3 / общ. ред. А. Ф. Лосева, В. Ф. Асмуса, А. А. Тахо-Годи. – 1994. – С. 421–500.


УДК 005:355.235.214

***Ж. Е. Белокурская,***
*кандидат филологических наук, доцент,*
*доцент кафедры межкультурных коммуникаций и рекламы*
*учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

## УЧЕБНАЯ ДИСЦИПЛИНА «ПЕРСОНАЛЬНЫЙ БРЕНДИНГ» В СТРУКТУРЕ ПОДГОТОВКИ КУЛЬТУРОЛОГОВ-МЕНЕДЖЕРОВ

**Аннотация.** Рассмотрены технологии построения и продвижения персонального (личного) бренда в рамках учебной дисциплины «Персональный брендинг». Представлены конкретные способы реализации цели и задач учебного курса на лекционных, семинарских и лабораторных занятиях. Обосновывается практическая значимость курса для